**Гарбачоў, М.** Баявых эпізодаў парахавая горыч / М. Гарбачоў // Лепельскі край. – 2016. – 23 лют. – С. 2.

# *БАЯВЫХ ЭПІЗОДАЎ ПАРАХАВАЯ ГОРЫЧ*

**Васіль Глушанок у 1985–1986 гадах праходзіў вайсковую службу ў абмежаваным кантынгенце Савецкіх войскаў у Афганістане. Дарэчы, Васілю Уладзіміравічу 25 лютага споўніцца 50 гадоў, а юбілей – заўсёды час падвядзення пэўных жыццёвых вынікаў.** Для Васіля Глушанка – гэта перш за ўсё дасягненні, якія звязаны з яго сям'ёй, здабыткамі ў асабістым жыцці. У гэтым пераканаўся, калі ў час нашай няспешнай гутаркі з Васілём Уладзіміравічам у трохпакаёвай кватэры з усімі зручнасцямі па вуліцы Максіма Горкага вярнуўся дадому пасля абласных спаборніцтваў па дзюдо на базе спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву “Асілак” яго сын Арцём.

– Якое месца заняў? – адразу запытаў Васіль Глушанок.

– Трэцяе, – адказаў сын.

І твар Васіля Уладзіміравіча адразу асвяціла радасная, задаволеная ўсмешка.

Мой малодшы сын Аляксандр таксама зэймаецца дзюдо, заваёўвае прызавыя месцы, – дадаў ён. – Ды і ў агульнаадукацыйнай школе атрымлівае добрыя адзнакі. А паколькі ў арміі я служыў у паветрана-дэсантных войсках, Аляксандр папрасіў сфагаграфаваць яго ў вайсковай форме дэсантніка. Фотапартрэт сына ў форме размясцілі на адной са сцен у кватэры. А побач прымацавалі і фотапартрэт Арцёма. Аднак Арцём ужо старшакласнік, таму сфатаграфаваны ў камізэльцы і з гальштукам.

– Кім працуе жонка?

– Настаўніцай пачатковых класаў.

– Якую прафесію абралі?

–У 1984 годзе закончыў Лепельскае СПТВ-56, вывучыўся на вадзіцеля аўтамашыны і трактарыста. Працаваў у аўтабазе № 14, а цяпер у лясгасе на трактары МТЗ-82 з пагрузчыкам вывожу з дзялянак лесаматэрыялы на прамсклад. За змену дастаўляю 35-36 кубаметраў драўніны.

– Як трапілі ў Афганістан?

– Восенню 1984 года прызвалі на тэрміновую службу. Спачатку быў накіраваны ў Фергану (Узбекістан) у вучэбку. Пасля некалькіх месяцаў аказаўся ў Афганістане. Служыў старшым вадзіцелем грузавой аўтамашыны КамАЗ у роце матэрыяльнага забеспячэння 345-га дэсантна-штурмавога палка 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Наша вайсковая часць размяшчалася ў горадзе Багран. Дастаўлялі з Хайратона, Пулі-Хурмы, Паншэра і іншых гарадоў, дзе былі склады і перавалачныя пункты матэрыяльнага забеспячэння, на нашу асноўную базу зброю, боепрыпасы, прадукты харчавання, іншыя вайсковыя грузы. Рухаліся калонамі да дваццаці аўтамашын па перасечанай горнай мясцовасці па дарогах-серпанцінах, калі уверх падымаешся максімальна выкарыстоўваючы магутнасць рухавіка, а ўніз спускаешся на тармазах. Звычайна спераду і ззаду па дзве калоны ехалі зеніткі, перамяшчаліся іншыя воінскія падраздзяленні аховы, якія папярэджвалі напады душманаў, знішчалі іх засады і мінныя “сюрпрызы”. Неаднойчы трапляў пад абстрэлы ворага, быў сведкам трагічнай гібелі нашых ваеннаслужачых, аднак асабіста мне пашчасціла – застаўся жывы.

– Ці часта сніцца па начах Афганістан?

– У першыя гады пасля вяртання з гэтай краіны ўспаміналіся і сніліся баявыя эпізоды той вайны, аднак цяпер яны ўсё больш сціраюцца з памяці, хаця асобныя, найбольш трагічныя фрагменты мне, мабыць, усё ж ніколі не ўдасца забыць.

**Мікалай Гарбачоў**